# ТЭМА 6.7. СУЧАСНЫЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ ДЛЯ НАВУЧЭНЦАЎ МАЛОДШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Перыядычнаму друку належыць значная роля ў развіцці беларускай дзіцячай літаратуры. Гісторыя беларускай перыёдыкі для дзяцей XX ст. пачынаецца з выдання літаратурнага і навукова-папулярнага часопіса "Лучынка", першы нумар якога выйшаў у 1914 г. Мэта часопіса была вызначана Цёткай у другім нумары, у звароце "Да вясковай моладзі беларускай": "<...> *«Лучынка» будзе старацца заглянуць у кожны куток нашай роднай беларускай старонкі, пазнаць усе яе балючкі, паказаць іх табе, моладзь, і растлумачыць, якім спосабам можна з гэтых балючак вылечыць родную старонку*"[1]. Першая сусветная вайна парушыла планы выдаўцоў – часопіс "Лучынка" спыніў існаванне.

На хвалі беларусізацыі 1920-х гг. надзвычай узрасла цікавасць да нацыянальнай культуры, літаратуры; пачаў інтэнсіўна пашырацца перыядычны друк. Так, на другой сесіі ЦВК БССР (1921) на дзяржаўным узроўні вялася гаворка аб праблеме нацыянальнай адукацыі: "<...> *ударнай задачай наркамасветы і яго органаў*" было абвешчана "*выданне падручнікаў, дзіцячага часопіса, навукова-папулярнай і палітычнай літаратуры на беларускай мове*"[2].

Першым беларускамоўным выданнем для дзяцей пасля рэвалюцыі стаў часопіс "Зоркі" (1921–1922), галоўным рэдактарам якога быў Змітрок Бядуля. На змену "Зоркам", пачынаючы са снежня 1924 г., прыйшоў штомесячны часопіс "Беларускі піянер" (з 1929 г. – "Іскры Ільіча", з 1945 г. – "Бярозка"); першым рэдактарам гэтага выдання быў Уладзімір Дубоўка, адказным сакратаром – Алесь Якімовіч.

З канца 1920-х гг. палітыка беларусізацыі ажыццяўлялася паралельна з разгорнутай па ініцыятыве ідэалагічных

[1] Цётка. Да вясковай моладзі беларускай / Цётка // Цётка. Выбраныя творы / уклад., прадм. В. Коўтун ; камент. С. Александровіча, В. Коўтун. Мінск, 2001. С. 178.

[2] Андрэева, Е. Адукацыя і педагагічная думка Беларусі : старонкі гісторыі : перыяд беларусізацыі / Е. Андрэева, Л. Лыч // Пачатковая школа. 2001. № 8. С. 32.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

службаў ЦК КП(б)Б барацьбой з так званым беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Гэта негатыўна адбілася на змесце, тэматычным і сэнсавым напаўненні часопіса "Беларускі піянер", які быў перайменаваны ў "Іскры Ільіча". З выданнем супрацоўнічалі такія пісьменнікі, як Я. Купала, Я. Колас, А. Якімовіч, Я. Маўр, З. Бядуля, Т. Кляшторны, Э. Агняцвет, К. Крапіва, М. Чарот.

У Вільні з 1927 па 1931 год выходзіў дзіцячы ілюстраваны часопіс "Заранка", які рэдагавала З. Верас. Вопыт працы ў "Заранцы" быў выкарыстаны ёю ў часопісе "Пралеска" (1934–1939), дзе яна працавала на працягу 1934–1935 гг. (з 1935 па 1939 г. – рэдактар А. Каткевічанка).

Такім чынам, гісторыя перыядычнага друку для дзяцей і юнацтва (першая палова XX ст.)[1] сведчыць пра мэтанакіраванае выхаванне маладога пакалення сродкамі мастацка-публіцыстычнай думкі.

На сучасным этапе развіцця літаратуры выходзіць некалькі айчынных выданняў для дзяцей на роднай мове: часопісы "Бярозка", "Вясёлка", "Буся", а таксама "Раніца"– газета-дадатак да выдання "Переходный возраст".

Штомесячны дзіцячы часопіс ЦК ЛКСМБ і Рэспубліканскага савета піянерскай арганізацыі імя У.І. Леніна "Бярозка" пачаў выходзіць адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны (1945), ён стаў працягам "Іскраў Ільіча".

Выданне вылучаецца зайздросным доўгажыхарствам, якое стала магчымым дзякуючы штодзённай карпатлівай працы рэдакцыі па адборы, пошуку і афармленні мастацкага і публіцыстычнага матэрыялу. Узначальвалі часопіс у апошнія гады Уладзімір Ягоўдзік (з 1997), Алена Масла (да 2011), Рагнед Малахоўскі (2011), Генадзь Аўласенка (з 2014), Святлана Дзянісава (в. а., 2016).

Сярод твораў, якія змяшчаліся на старонках часопіса на працягу апошніх гадоў, – лепшыя здабыткі дзіцячай літаратуры і твораў для юнацтва. Паэтычныя тэксты для юнага чытача прапанавалі маладыя і ўжо вядомыя аўтары: А. Бадак, Р. Барадулін, Д. Бічэль, Г. Бураўкін, В. Гардзей, В. Зуёнак,

[1] Больш падрабязна пра гэта глядзі ў тэме 3.1 "Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ў 1920–1930-я гг.".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У. Мазго, С. Панізнік, М. Чарняўскі. На старонках часопіса друкаваліся апавяданні У. Машкова, П. Місько, А. Наварыча, Л. Рублеўскай, С. Тарасава, В. Ткачова, А. Федарэнкі. Матэрыялы гэтага выдання змястоўныя, займальныя, надзённыя, выхаваўчыя паводле зместу. Тут змяшчаюцца цыклы гістарычных публікацый пра славутыя мясціны Беларусі: Ружаны, Полацк, Камянец, Косава, Гродна, Мінск, Мсціслаў. У. Мароз падрыхтаваў серыю апавяданняў па гісторыі Беларусі "Ланцужок айчыннай гісторыі" (XII–XX стст.), якія прасякнуты ідэямі беларускага дома, еднасці, павагі да роднай гісторыі. Выхаванню працавітасці, пытанням выбару прафесіі прысвечаны прафарыентацыйныя матэрыялы раздзела "Знайдзі сваю сцяжыну". Публікуюцца на старонках некаторых нумароў і творы папулярнай у юнацкай аўдыторыі навуковай фантастыкі (напрыклад, В. Кастручын "Бывай, Чэлсі!", А. Кірвель, "Той-Бераг"), якая захапляе дзяцей і падлеткаў, стымулюе іх да ўспрымання літаратурных тэкстаў на беларускай мове.

У 2012–2015 гг. "Бярозка" выходзіла ў якасці дадатку да часопіса "Маладосць". Выданне прапаноўвала рубрыкі "Літаратурныя старонкі" і "Беларуская літаратура". Гэта, па-першае, давала магчымасць юным чытачам пазнаёміцца з навінкамі "малой" прозы, па-другое – з літаратурна-крытычнымі матэрыяламі ў адносінах да нацыянальнай мастацкай літаратуры. "Верасок-паэзія" і "Верасок-проза" – старонкі часопіса, адведзеныя пад літаратурныя спробы падлеткаў. Слушныя парады маладым аўтарам давалі спрактыкаваныя майстры слова ў аддзеле "Практыкум". Там знаходзім характарыстыку вершаваных памераў, тлумачэнне літаратуразнаўчых паняццяў і ілюстрацыі да іх з мастацкіх твораў. У сучаснай "Бярозцы" прадстаўлены таксама наступныя аддзелы: прафарыентацыйны – "Школа журналістыкі", школьны – "Настаўніцкая на праслушцы", патрыятычны – "Я – сардэчка Беларусь", кулінарны – "Гатавальня". Псіхолагі і педагогі шчыра абмяркоўвалі з чытачамі праблемы наладжвання бяспечных зносін, асаблівасцей самаразвіцця, міжасобасных канфліктаў (рубрыкі "Ч-факторыя", "Па-даросламу", "Калі сур'ёзна").

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У 2015 г. часопіс “Бярозка” аднавіў свой выхад у поўным фармаце з новымі рубрыкамі. У “Level 80”, напрыклад, прапаноўваецца анатацыя на сучасныя фільмы. У аддзеле “Зярняткі веры” расказваецца пра асаблівасці падачы памінальнай запіскі ў храме, пра місію хроснага бацькі і хроснай маці. “Гісторыя поспеху” асвятляе кар’ерныя дасягненні вядомых асоб. Арганізацыі змястоўнага адпачынку, асэнсаванаму стаўленню падлеткаў да жыцця спрыяе “Каляндар «Бярозкі»: Даты і Падзеі. Што ўспомніць, чым заняцца, што прачытаць”. Відавочным з’яўляецца ўзмацненне забаўляльнасці ў часопісе. На трынаццатай яго старонцы прадстаўлены *“страшылкі”* і *“прыколы”*. Акрамя таго, выданне прапаноўвае апісанне гульняў, жарты, апытанкі, трэнінгавыя практыкаванні для адпачынку.

У 2016 г. у “Бярозцы” з’явіўся дадатак “Я — мастак” пра выяўленчае мастацтва: гісторыя, тэорыя і практыка (рубрыка “Я ведаю мастацтва”), набыткі нацыянальнай культуры (рубрыка “Я вучуся ў беларусаў”).

Сёння часопіс “Бярозка” ўваходзіць у склад Выдавецкага дома “Звязда”, мае ўласны сайт (http://zviazda.by/be/edition/byarozka), дзе можна пазнаёміцца з апошнімі нумарамі ў фармаце pdf.

“Вясёлка” (з 1957) — самы папулярны і шматтыражны з сучасных беларускамоўных дзіцячых часопісаў краіны, тройчы лаўрэат Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ “Залатая ліцера”. Яго галоўнымі рэдактарамі ў розныя часы былі выдатныя майстры слова В. Вітка, Е. Лось, А. Грачанікаў; з 1978 г. галоўным рэдактарам часопіса з’яўляецца У. Ліпскі. Асноўныя напрамкі дзейнасці часопіса вызначаны ў першых нумарах: “<...> *трэба навучыць дзяцей любіць сваю радзіму; трэба прывіць ім любоў да роднай мовы, спадчыны, гісторыі, культуры; трэба, каб дзеці нашы ўмелі шанаваць людзей, якія цярпліва выводзяць іх на жыццёвыя пуцявіны. Усё гэта разам і ёсць тая нацыянальная ідэя, увасабленне якой у душы і сэрцы дзяцей робіць іх сапраўднымі патрыётамі*”[1]. Часопіс не здраджвае традыцыям — цяперашні рэдактар У. Ліпскі сцвярджае:

[1] Ліпскі, У. Сябар і настаўнік дзяцей // Не выжываю, а жыву / У. Ліпскі ; аўт.-уклад. М. Яфімава. Мінск, 2005. С. 77.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Нас часам правакуюць: трэба ісці наперадзе сучасных дзяцей, даводзіць ім пра інтэрнэт, бізнес, сказаць праўду, хто ж прыносіць дзяцей у сем'і, як яны з'яўляюцца на свет... Ды ўсе-такі для нашых чытачоў, як і для "Вясёлкі", ёсць вечныя тэмы: Радзіма, мама, прырода, сябры, дабро, прыгажосць"*[1].

Адпаведна тэматыцы, вызначанай рэдакцыяй, былі створаны рубрыкі "Тэатр Васі Вясёлкіна" (сцэнкі, сцэнарыі беларускамоўных пастановак і свят), "Крышку пра кніжку" (анатацыі на новыя кнігі для дзяцей), "Кацілася торба" (фальклорныя матэрыялы – гульні, апавяданні, казкі, жарты, забаўлянкі), "Хвілінкі-весялінкі" (вершыкі, скорагаворкі, красворды, загадкі, анаграмы, задачы, рэбусы, вясёлыя пытанні), "Вернісажык «Вясёлкі»" (малюнкі чытачоў і парады прафесійных мастакоў). Асобныя старонкі гэтага выдання прысвечаны юбілеям беларускіх пісьменнікаў: кароткія біяграфічныя звесткі пра таго ці іншага мастака слова суправаджаюцца яго творамі. Сёння чытач можа таксама пазнаёміцца з раздзеламі "Чароўны куфэрак" (дзіцячыя казкі, допісы, вершы), "Верш на памяць: жывая класіка", "Народны каляндар «Вясёлкі»" (звесткі пра народныя святы), "Казачны год разам з «Вясёлкай»" (казачныя сюжэты народаў свету). Выданне не абмяжоўваецца творамі беларускіх пісьменнікаў: на яго старонках можна сустрэць пераклады з польскай, літоўскай, рускай, украінскай моў.

Вялікую ўвагу рэдакцыя "Вясёлкі" надае творчасці чытачоў: на старонках часопіса змяшчаюцца вершы, загадкі, невялікія апавяданні, малюнкі падпісчыкаў.

Агульны персанаж усіх нумароў часопіса – Вася Вясёлкін. Выданне гаворыць з чытачамі яго даходлівай, добразычлівай, шчырай мовай.

Да 2013 г. у "Вясёлцы" дзецям дашкольнага ўзросту адрасаваўся дадатак "Каласавічок", у якім друкаваліся вершы, загадкі, кароткія апавяданні, казкі, змяшчаліся размалёўкі.

З 2013 г. рэдакцыя "Вясёлкі" распачала выпуск асобнага часопіса "Б у с я ", які арганізавалі У. Ліпскі, Р. Баравікова, У. Жук і мастакі В. Дударанка і В. Чэпік. "Буся" і "Вясёлка" сталі "*верныммі сябрамі*" юных чытачоў – менавіта так рэпрэ-

---

[1] Тамсама. С. 80.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зентавалася ім і іх бацькам чытанка-маляванка для дзяцей дашкольнага ўзросту. *"Дарагія чытачы! // Нагадаю, як завуся. // Мяне клічуць гожа – Буся! // Я з'явіўся сябраваць // І вучыць, // І забаўляць. // Весяліцца разам з вамі. // Будзем добрымі сябрамі"*[1], – так Н. Галіноўская ад імя "Бусі" вызначыла яго задачу.

Выданне ўяўляе сабой чытанку-маляванку для маленькіх дзяцей. Бусляня Буся – вядучы персанаж-навігатар чытанкі. Зараз у выданні ёсць і разразная кніжка-маляванка з выявамі жывёл, птушак, матылёў, і "Бусеў слоўнічак", дзе тлумачацца складаныя словы, і вернісаж "Бусяняты-мастакі" з малюнкамі выхаванцаў дзіцячых садкоў, і "Чыстагаворкі", і коміксы па матывах народных казак. Асноўная ж каштоўнасць выдання – маленькія ілюстраваныя мастацкія тэксты на кожную літару алфавіта, надрукаваныя буйным шрыфтам па складах, каб дзіця магло навучыцца чытаць па-беларуску.

Рэдкалегія "Бусі" праводзіць мэтанакіраваную працу па фарміраванні навыкаў вуснага маўлення. Дасягненню гэтай мэты спрыяе, акрамя іншага, і рубрыка "Бусеў слоўнічак". Вось як, напрыклад, абыгрываюцца Святланай Богуш гук і літара К: *"Сябрукоў у Бусі шмат: // Качка, кнігаўка, каршак, // Конік, каня, конь, крумкач, // Крот, кажан, каршун, касач. // А руплівая казуля // Сшыла бусліку кашулю, // Капялюш і камізэльку, // Да яе – каўнер, кішэньку. // Буся ходзіць па балоце: // Дзе сяброў такіх хто знойдзе?"*[2].

У 2011 г. у дадатак да сайта выдання (http://www.veselka.by) была створана адкрытая група сяброў часопісаў "Вясёлка" і "Буся" ў сацыяльнай сетцы "УКантакце"[3]. На 2016 г. рэсурс налічвае больш за 1100 удзельнікаў. Рэдакцыя пакінула каля 2670 запісаў на "сцяне" старонкі часопіса – анонсаў новых нумароў, справаздач з мерапрыемстваў рэдакцыі, жартаў, ме-

[1] Галіноўская, Н. Дарагія чытачы / Н. Галіноўская // Буся. 2013. № 1. С. 2.

[2] Богуш, С. Бусеў слоўнічак / С. Богуш // Вясёлка [Электронны рэсурс]. 2016. № 3. Рэжым доступу : http://www.veselka.by/?p=9212. Дата доступу : 08.09.2016.

[3] Дзіцячыя часопісы "Вясёлка" і "Буся" : пра дзяцей і для дзяцей [Электронны рэсурс]. 2011–2016. Рэжым доступу : https://vk.com/veselkaby. Дата доступу : 08.09.2016.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

маў, вершаў, калыханак, карысных спасылак. Створаны фотаальбомы і серыі відэазапісаў.

Пасля "перабудовы" 1980-х гг. актывізаваўся рэлігійны перыядычны друк для дзяцей. Так, з 1990-х гг. да цяперашняга часу выходзіць беларускамоўны часопіс "Маленькі рыцар Беззаганнай" – дадатак да каталіцкага выдання "Ave Maria" Мінска-Магілёўскай дыяцэзіі (рэдактар – Ірына Жарнасек). Звяртаючыся да чытача, рэдакцыйная калегія вызначыла наступныя мэты выдання: "*Вітаем вас і працягваем руку на сяброўства! Наш часопіс найперш адрасаваны дзецям. Але, спадзяемся, што ён цікавы таксама і іхнім бацькам, асабліва тым, якія прагнуць, каб іхнія дзеці выраслі духоўна багатымі. Каб яны пазнавалі Бога не толькі ў святыні, але і ў мастацкіх творах, каб вучыліся разважаць над жыццём, ацэньваць свае ўчынкі.* <...> *На старонках нашага часопіса вас чакаюць сустрэчы з цікавымі людзьмі, вы зможаце прачытаць пра святых людзей, якія пражылі прыгожае жыццё, зможаце павучыцца ў гэтых людзей мудрасці. Наш часопіс расказвае таксама пра жыццё дзяцей, якія дзень па дні пазнаюць Бога. Рэдакцыя заўсёды радуецца, калі атрымлівае ад сваіх чытачоў лісты, малюнкі, цікавыя апавяданні і прапановы. Многія з іх мы друкуем у нашым выданні. Удзельнічаючы ў конкурсах, адгадваючы розныя загадкі, крыжаванкі ды галаваломкі, вы таксама будзеце пазнаваць духоўную культуру нашай радзімы ды ўсяго хрысціянскага свету*"[1].

Галоўны герой часопіса – хлопчык, Маленькі рыцар Беззаганнай (Беззаганнай каталікі называюць Дзеву Марыю, або Божую Маці). Тут змяшчаюцца матэрыялы розных жанраў, але аб'ядноўвае іх тэма еднасці з Богам, імкненне да духоўнага ўдасканалення. Рыцар знаёміць сваіх сяброў з вершаванымі апавяданнямі (І. Жарнасек, "Знойдзеная згуба"), песнямі (Р. Грушэцкі, "Разгорнем блакіту штандары" (пер. з польскай мовы), "Веру, Пане"), вершамі (У. Сіўчыкаў, "Калядны ліст", М. Дукса, "Усмешка нябёсаў", Д. Бічэль, "У карагодзе хмарак і анёлаў", "Цуд"), апавяданнямі (І. Жарнасек, "Адрэ-

[1] Жарнасек, І. Пра часопіс / І. Жарнасек // Маленькі рыцар Беззаганнай [Электронны рэсурс]. 2012. Рэжым доступу : http://mrb.ave-maria.by. Дата доступу : 02.09.2016.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

налін", "Страх адкінь"), паданнямі ("Радасная смерць Кверыны"), казкамі (І. Жарнасек "Малеча", Г. Старыковіч, "Анёлахоўнік"), прыпавесцямі ("Ці трэба?", "Два вяслы", "Конь і асёл", "Дзве рыдлёўкі"), малітвамі для маленькіх: "*Анёле Божы, дружа мой, // Ты заўсёды пры мне стой. // Рана, ўвечар і ўначы // Будзь ласкаў мне памагчы // Змагчы духа злога, // Верна служыць Богу, // Любіць маму, тату, // Край і родну хату. Душу, цела сцеражы, // Да жыцця вечнага давядзі. // Амэн*"[1]. Цікава, што часта аўтары некаторых вершаў і апавяданняў не падпісваюцца або падпісваюцца крыптанімамі, ахвяруючы сваю працу Божай справе. У рубрыцы "Гульні, загадкі, крыжаванкі" гэтага часопіса змяшчаюцца загадкі, смяшынкі-весялінкі, крыжаванкі, рэбусы, зразумела, пераважна рэлігійнай тэматыкі. Апошнім часам папулярнымі сярод чытачоў стала рубрыка "Усё пра скаўтаў", якая складаецца з раздзела для дзяўчынак "Старонка «божых каровак»" і для хлопчыкаў "Старонка ваўчанятаў".

Сярод іншых выданняў для дзяцей часопіс "Маленькі рыцар Беззаганнай" вылучаецца не толькі тэматыкай, але і афармленнем. Мастак Г. Хінка-Янушкевіч зрабіла яго цёплым, жыццярадасным, светлым. Прымаюць удзел у ілюстраванні гэтага выдання і дзеці – яе навучэнцы з каледжа мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка.

З 1995 г. радаваў маленькіх чытачоў фотачасопіс "Лесавік", заснавальнікам і выдаўцом якога стаў Уладзімір Ягоўдзік. Рэдакцыя так вызначыла від выдання – часопіс сяброў прыроды: экалагічнае выданне для сям'і і школы. Верш М. Танка "Экалогія" вынесены на плакат спецвыпуску "Бараніце прыроду ад пажараў": "*А мы, прызнацца, // Хоць і мінулі // Тысячагоддзі, // І да гэтага часу // Не ўмеем хадзіць // Па зямлі // Так, як дні і ночы, // Звяры і птушкі, // Ветры і дажджы. // Няўжо не бачыце, Як яе здратавалі, // Вытапталі, // Пакалечылі? // А яшчэ збіраемся // Такія ж сляды // Пакінуць // І на іншых планетах*"[2].

[1] Малітва // Маленькі рыцар Беззаганнай : дад. да час. "Ave Maria". 1998. № 7. С. 17.

[2] Танк, М. Экалогія / М. Танк // Родныя вобразы [Электронны рэсурс]. 2009–2016. Рэжым доступу : http://rv-blr.com/verse/show/95512. Дата доступу : 28.08.2016.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Унікальная асаблівасць гэтага часопіса – выдатнае афармленне, у якім з поспехам выкарыстоўваюцца рэдкія фотаздымкі, постэры птушак і звяроў вядомага заафатографа І. Бышнёва, фотазагадкі "Пазнай птушку (жывёлу)". Рэдакцыя ажыццявіла выхад тэматычных нумароў-фотарэпартажаў пра нацыянальныя паркі Беларусі, напрыклад, "Браслаўскія азёры", "Нарачанскі".

Задача выдаўцоў – экалагічнае выхаванне падрастаючага пакалення на літаратурным матэрыяле. На старонках "Лесавіка" друкуюцца беларускія пісьменнікі А. Наварыч (апавяданне "Жук-алень), К. Кірэенка (апавяданне "Жураўліныя дзянёчкі"), А. Пісьмянкоў (вершы пра прыроду). Побач з імі па-беларуску загучалі творы славутага рускага прыродазнаўцы В. Біянкі "Краснагон" і "Гападар лесу".

У рубрыцы "Лесніčоўка" рэдакцыя праводзіць прэзентацыі новых беларускамоўных кніг пра прыроду У. Ягоўдзіка, А. Пісьмянкова, У. Марука і іншых аўтараў.

Вялікую ўвагу "Лесавічок" надае ліставанню з чытачамі, дзіцячай творчасці, правядзенню конкурсаў. На яго старонках шырока выкарыстоўваюцца малюнкі дзяцей, рэдагуюцца і публікуюцца іх казкі, вершы, апавяданні ("Як лячылі рэха", "Каб я была казачніцай", "Дзівосныя пацеркі", "Вядзі нас, жолуд", "Сінявочка", "Дзьмухаўцова мара", "Наш лес", "Мой добры дружа").

У канцы кожнага нумара – традыцыйна для дзіцячага выдання – старонка для забаўлянак, скорагаворак, акразагадак (жанравая разнавіднасць загадак, дзе адгадку можна прачытаць па першых літарах вершаваных радкоў), размалёвак. У разварот часопіса часам "ушываюцца" настольныя гульні (напрыклад, "У госці да Дзеда Мароза", "Смелы вожык"), для наладжвання якіх дастаткова склеіць фішкі або мець звычайны кубік.

Якасны фотачасопіс патрабуе вялікіх выдаткаў, якіх няма, таму выхад "Лесавічка" спынены.

Адна са старэйшых беларускамоўных газет для дзяцей "Раніца" (1993–2012) раней (1929–1993) выходзіла пад назвай "Піянер Беларусі". У 2012 г. "Раніца" стала дадаткам да рускамоўнага выдання "Переходный возраст" (галоўны рэ-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дактар – Жанна Шчурок[1]). Агульную канцэпцыю абодвух выданняў акрэслівае рэдактар сайта названай газеты: "*Газета «Переходный возраст» – единственное специализированное государственное издание для подростков, учредителями которого являются Министерство образования Республики Беларусь и ОО «БРСМ». Возраст читателей газеты составляет 12–18 лет <...>. Более 50 рубрик, содержащих самую разнообразную информацию о подростках и для подростков и позволяющих высказаться читателям (более 1/3 газеты предоставлено для публикаций юных авторов), регулярно появляются на 16 страницах 4 раза в месяц*"[2].

Газета "Раніца" зараз – дзве штомесячныя паласы-ўкладышы, першая з якіх змяшчае традыцыйную "Цытату месяца", а другая ("Планета натхнення") – пераважна мастацкія і публіцыстычныя тэксты навучэнцаў школ. Юныя карэспандэнты газеты "Переходный возраст" актыўна друкуюцца на старонках "Раніцы", спрабуюць сябе ў літаратурна-мастацкай творчасці, публіцыстыцы. Можна сказаць, што "Раніца" стала своеасаблівай лабараторыяй, дзе кожны, хто мае жаданне пісаць, можа паспрабаваць свае сілы.

Матэрыялы па пытаннях выхавання дзяцей, мастацкія творы для іх змяшчаюцца і ў навукова-метадычных часопісах "Пачатковая школа", "Пралеска", "Роднае слова", "Адукацыя і выхаванне", "Пачатковае навучанне".

Сучасныя беларускія перыядычныя выданні для навучэнцаў рознага ўзросту выконваюць некалькі функцый: інфармацыйную, пазнавальную, развіваючую, выхаваўчую. Кожная з гэтых функцый мае свае базісныя вектары, скіраваныя на арыентацыю чытача (слухача) у свеце жыццёвых узаемаадносін, культуры, літаратуры, мастацтва, духоўнасці і інш. Усе гэтыя вектары ў сваю чаргу перакрыжоўваюцца ў выхаваўчай сферы, якую можна акрэсліць наступным чынам: вучыць любіць, прывіваць любоў, спрыяць шанаванню блізкага

[1] Па дадзеных Цэнтральнай дзіцячай абласной бібліятэкі г. Мінска 2012 г.

[2] «Переходный возраст» : взрослей с нами! : о газете // Переходный возраст [Электронны рэсурс]. Режим доступа : http://www.pvz.by/?page_id=2. Дата доступа : 12.08.2016.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і дарагога. У гэтых адносінах перыядычны друк для дзяцей выконвае функцыю педагога, выхавацеля — таму ён павінен быць запатрабаваным ва ўстановах адукацыі.

## Пытанні і заданні

1. Якія сучасныя перыядычныя выданні для навучэнцаў малодшага школьнага ўзросту вы ведаеце? Ахарактарызуйце іх структуру і змест.

2. Якія метадычныя часопісы можа выкарыстоўваць педагог для правядзення вычэбных заняткаў па чытанні? Вызначце структуру і змест такіх заняткаў.

3. Як сфармуляваў задачы рэдакцыі часопіса "Вясёлка" У. Ліпскі?

4. Назавіце рубрыкі часопіса "Вясёлка" і ахарактарызуйце іх змест.

5. Пазнаёмцеся з інтэрнэт-старонкамі часопісаў "Вясёлка" (http://www.veselka.by/), "Бярозка" (http://zviazda.by/be/edition/byarozka), "Маленькі рыцар Беззаганнай" (http://mrb.ave-maria.by) і ацаніце іх паводле наступных крытэрыяў: 1) інфарматыўнасць, 2) даступнасць інфармацыі для дзяцей, 3) дызайн і зручнасць інтэрфейса, 4) рэгулярнасць абнаўлення. Вылучыце лідара сярод гэтых выданняў.

## Літаратура

### Асноўная

1. Андрэева, Е. Адукацыя і педагагічная думка Беларусі : старонкі гісторыі : перыяд беларусізацыі (20-я гг. XX ст.) / Е. Андрэева, Л. Лыч // Пачатковая школа. 2001. № 8. С. 32—33.

2. Ліпскі, У. "Не выжываю, а жыву!.." : дапаможнік / аўт.-уклад. М. Яфімава. Мінск, 2005.

3. Малітва // Маленькі рыцар Беззаганнай : дад. да час. "Ave Maria". Мінск, 1998. № 7. С. 17.

4. Цётка. Выбраныя творы / Цётка ; уклад., прадм. В. Коўтун ; камент. С. Александровіча, В. Коўтун. Мінск, 2001.

### Дадатковая

1. Воюш, И. Привлечение аудитории к интернет-сайтам отечественных детских изданий / И. Воюш // Журналістыка-2013 : стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы XV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 5—6 снежня 2013 г. Мінск, 2013. С. 264—268.

2. Несцяровіч, В. Беларуская дзіцячая літаратура / В. Несцяровіч, М. Шаўлоўская. Мінск, 2008.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Харитонова, С. Визуально-семантические особенности первых белорусских периодических изданий для детей / С. Харитонова // Журналістыка-2011 : стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы XIII Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 8–9 снеж. 2011 г. Мінск, 2011. С. 72–75.

4. Харитонова, С. Тенденции развития современной белорусской прессы для детей / С. Харитонова // Журналистика в 2009 г. : Трансформация систем СМИ в совр. Мире : сб. материалов Междунар. науч-практ. конф., Москва, 9–11 февр. 2010 г. / Моск. гос. ун-т ; редкол. : Е. Вартанова [и др.]. М., 2010. С. 325–326.

**Электронныя рэсурсы**

1. Часопісы "Вясёлка" і "Буся" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : http://www.veselka.by. Дата доступу : 09.09.2016.

2. Часопіс "Бярозка" ў складзе часопіса "Маладосць" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : http://www.maladost.lim.by/berezka. Дата доступу : 09.09.2016.

3. Часопіс "Бярозка" ў складзе Выдавецкага дома "Звязда" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : http://zviazda.by/be/edition/byarozka. Дата доступу : 09.09.2016.

4. Часопіс "Маленькі рыцар Беззаганнай" [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : http://mrb.ave-maria.by. Дата доступу : 09.09.2016.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова